— **Ю. Х.:** Меня всегда раздражали наши политики из-за того, что они не обращаются к профессионалам. Я спорил со многими из них, говорил: *«Как вы можете что-либо делать без аналитической группы? Как вы можете что-либо делать без режиссера, который вам создаст образ, имидж? Почему вы уверены, что лучше всех знаете, как построить пиаровскую кампанию? Есть же профессионалы».* И вот первое потрясение в хорошем смысле слова – ко мне обратился Семен Николаевич Домаш. Я начал ему помогать, потому что понял: конкретно этот политик хотя бы на этом этапе окружает себя профессионалами. Думаю, что раз он начал себя окружать профессионалами на этом этапе, то это просто его подход к делу, значит, он знает, что надо окружать себя профессионалами и на следующих этапах. И меня радует Домаш. Сегодня это совершенно другой человек, другой политик. Мне ужасно нравилось смотреть на его рост. Я наблюдал, как из провинциального экс-губернатора начал вырастать серьезный политик. Последние события это доказывают. Вспомните, в чем все обвиняли нашу демократическую тусовку. Главная претензия была, что они не могут договориться между собой. Потому что у каждого свои амбиции. Первый политик, который начал думать иначе, – это Домаш. У него в штабе образовалась самая грамотная группа. Мы все время говорили, что перед нами две стратегии. Первая по приоритетности – победить этот режим. И только вторая – чтобы победил наш кандидат. Нельзя ни в коем случае забывать про первую стратегию, а очень многие группы ее забыли и начали заниматься турниром на местном уровне. На что, кстати говоря, и рассчитывали аналитики Лукашенко и до сих пор рассчитывают. Потому что главные враги в политике те, кто существует на одном электоральном поле.

Политик – это прежде всего человек, способный на компромисс. Мудрость именно в этом. Другое дело, что у каждого компромисса должны быть пределы.

— **А. К.:** *Но не был ли этот компромисс чрезмерным? Не окажется ли он поражением не только Домаша, но и демократических сил на данном этапе?*

— **Ю. Х.:** Да, сегодня этот компромисс выглядит чрезмерным. Потому что было бы неплохо, чтобы кроме Домаша вокруг были и другие политики. Но сегодня в политике главенствуют те же принципы, что и у бандитов. Их спрашиваешь: *«Сколько вы хотите у меня отобрать?»* Они, мягко улыбаясь, говорят: *«Все».* Такого тоже не должно быть. В какой-то момент партии, поняв, что надо идти на компромисс, бросили Домаша. Он и этот удар держал. Чрезмерным этот компромисс стал не из-за позиции Домаша, а из-за растерянности и мягкотелости демократических партий, совершивших ошибку, которую совершает любая юная девушка. Сначала позволяет молодому человеку близость до свадьбы, а потом бегает за ним и просит жениться. Партии так и поступили.

А Домаш, понимая, что может один испортить идею единства, хорошо держал удар, не ввязывался ни в какие склоки, хотя стравить их с Гончариком пытались очень многие. И я видел, насколько трудно ему иногда себя сдерживать. Потому что были и откровенно провокационные статьи, например, Оргиша в «Народной воле». Любой человек после такого пойдет вкривь да вкось, но не Домаш.

Ведь номенклатура в хорошем смысле слова всегда отличалась у нас тем, что любила говорить, как недавно сказал Леонов: *«Не надо считать народ быдлом».* Но у меня создалось впечатление, что это он сказал для себя, что он до сих пор пытается себя уговорить.

Поэтому интрига, которую они затеяли, может быть, сегодня имеет большой смысл. Но они не подумали о тех людях, которые идейно работали и которые после их решения оказались, мягко говоря, в растерянности. Сейчас они начинают осознавать, что все-таки должны поступить правильно, заключив соглашение. И партии к этому пришли. Думаю, что в ближайшее время оно будет заключено. (*Беседа происходила еще до заключения соглашения –* **Ред.**)

Президентская власть в Беларуси огромна и неисчерпаема, и в принципе в этой системе любой человек, который хочет властью воспользоваться, мгновенно становится диктатором. Поэтому без общественного договора о том, как президент расстанется с частью своей власти, как он поделится ею с обществом, нельзя обходиться. Это поняли наши политические партии, слава Богу. И думаю, что в ближайшее время та сторона, наша номенклатура, Гончарик, это тоже поймет. На одной интриге, без людей, вдохновленных идеей победы, они не обойдутся. Нужен компромисс. Компромиссу научился Домаш, и должен научиться и Гончарик.

— **А. К.:** *Каким должен быть формат этого соглашения?*

— **Ю. Х.:** Я не профессионал в политике, я режиссер, но мне кажется, два кандидата – это люди, могущие занять два самых сильных поста: президента и премьер-министра. Чисто пиаровский замысел очень интересен. Гончарик и внешне, и по складу характера может восприниматься как гарант стабильности. Этого хочет большая часть общества, потому что боится потерять даже то, что есть. Домаш по своей динамике, по своей успешности (а у него действительно очень успешная карьера) это человек, являющийся гарантом перемен, которые мы тоже все ждем. Мы ждем перемен в стабильной обстановке. И два человека могут олицетворять собой эти две важные крайности, которые от них хочет общество. Вот в какую сторону надо сейчас пиарить. И эта пиаровская система сегодня мне кажется даже интереснее, чем работа на кого-то одного. ■

КОЛА ГІСТОРЫІ

# ІНТА — ЧОРНАЯ ПЛЯМА БЕЛАРУСАЎ

АДАМ ГЕАРГІЕЎСКІ

**Дзесяткі тысячаў дарэмна змарнаваных лёсаў, загубленных жыцьцяў ды трызны на людзкіх парэштках пад штандарам пабудовы камунізму. Гэта трагічная й крывавая спадчына, што яднае мястэчка Інта ў былой Комі АССР зь Беларусьсю.**


Жахлівая гісторыя на гэтым кавалку паўночнае зямлі распачалася яшчэ ў 30-х, калі сярод лёдагораў ды бязьмежнае тундры зьявіліся першыя вязьні. Акурат з таго часу пачынаецца сапраўднае засяленьне гэтых краёў. Нячулых паўночных зьвяроў пасунула хваля нявольнікаў-чужынцаў, якія былі ў нечым нязгодныя зь дзейным бальшавіцкім рэжымам.

Па вайне на будаўніцтва Інты накіроўваліся эшалён за эшалёнам з папаўненьнем зь ліку новых сталінскіх ахвяраў. Сярод вязьняў апынуліся такія людзі, як князь Базыль Сьвятаполк-Мірскі, Ларыса Геніюш і шмат іншых вядомых асобаў, якія сталіся пакутнікамі й палоннымі неабсяжнай поўначы.

Як сацыяльны, гэтак і нацыянальны склад вязьняў быў надзвычай стракаты. Сярод тысячаў жаўнераў Украінскай паўстанчай арміі ды спагадаючым ім сялянаў, матляліся летувісы зь ліку «лясных братоў», якія ў паваенныя гады змагаліся за сваю дзяржаўную самастойнасьць пад сьцягамі генерала-антыкамуніста Пляхавічуса. Шмат было й польскіх «акаўцаў», расейцаў, а разам зь імі й нашых землякоў-патрыётаў.

Тое, што на будаўніцтвах чыгунак ды шашы сярод адвечнае мерзлаты ўтрымліваліся ня простыя крымінальнікі, пераконвае цэлая хваля паўстаньняў з палітычнымі патрабаваньнямі. У 1948 годзе на будаўніцтве № 501 каля мястэчка Лабызнанг выбухнула адно зь іх. Абураныя паўстанцы мелі на мэце дасягнуць Варкуты, каб атрымаць магчымасьць зьвярнуцца да грамадзкасьці праз радыё. Паводле сьведкаў тамтэйшых падзеяў і непасрэдных удзельнікаў паўстаньня, на чале бунту стаяў падпалкоўнік Бялоў. Мясцовыя карныя ворганы, каб хутчэй перамагчы паўстанцаў, абяцалі за галаву кожнага ўдзельніка тутэйшым паляўнічым тундры па колькі кілаграмаў мукі.

Мінулі гады, але знак гэтай трагедыі нагадвае пра сябе. Апусьцелыя кашары, дзе раней утрымліваліся палітвязьні, мэталёвыя краты, якія памятаюць людзкія енкі й бязьлітасных вартаўнікоў. На поўначы Інты сёньня месьціцца гаспадарчая фэрма па гадоўлі хатняй птушкі. А між іншым, на пачатку 50-х менавіта


Мікалай Каржанеўскі – былы палітвязень лагеру пад Інтой. 1997.

тут былі закатаваныя й таемна пахаваныя звыш 5 тысячаў вязьняў рознага паходжаньня: украінцы, расейцы, беларусы, палякі, летувісы й іншыя.

Акурат ў 1951 годзе, калі бракавала месцаў у кашарах для зьняволеных, НКУС распачаў зьнішчэньне часткі палітвязьняў, якія, на іхную думку, былі ўжо непатрэбныя ў якасьці працоўнае сілы. Гэткім чынам у суседнім з Інтой пасёлку Абезь свой апошні прытулак знайшлі каля 8 тысячаў ахвяраў. Дарэчы, тутэйшыя адмыслоўцы ўважаюць, што сярод замардаваных было некалькі тысячаў колішніх жыхароў Заходніх Беларусі й Украіны, якія гвалтам былі дэпартаваныя наконадні нямецка-савецкай вайны.

Яшчэ 3 тысячы вязьняў былі зьнішчаны ў вёсцы Касю. Дзеля надзейнасьці целы нябожчыкаў адмыслова праціналіся мэталёвымі стрыжнямі. Калі выслухваеш сьведкаў гэтых падзеяў, то мімаволі па скуры бегаюць мурашы. Чарговы раз аповеды пераконваюць у бязьлітаснай сыстэме, якая існавала ў савецкай краіне.

Але гаворку можна было б спыніць, узгадаўшы чытачу пра яшчэ адну чорую пляміну беларускага народа, якая знаходзіцца гэтак далёка ад нас. Але...

Колькі гадоў таму на месцы былых вязьніцаў Комі АССР ды пахаваньняў зьняволеных былі ўсё-ткі ўсталяваны некалькі памятных крыжоў. Перадусім, пра загінуўшых суайчыньнікаў узгадалі летувісы, якія надалі гэтай гістарычнай старонцы шмат пільнае ўвагі – пабудавалі належную капліцу. Па прыкладу балтыйскіх братоў зрабілі й украінцы.

Пра нашых землякоў узгадалі толькі прыватныя асобы зь ліку нашчадкаў былых зьняволеных, якія паставіўшы сьціплы самаробны 4-мэтровы крыж сярод сьнежных гурбаў і пустэчы, хутчэй аддалі даніну пашаны сваім прашчурам. Безумоўна, што большага ад іх нельга патрабаваць, бо пра сваіх палеглых на чужыне суайчыньнікаў мусіць памятаць сама дзяржава. Дзякуючы пачынам ды намаганьням тубыльцаў-камякоў ды шэрагу рупліўцаў-беларусаў зусім нядаўна зьявілася шыльдачка з надпісам: «*Вечная памяць братам і сёстрам зь Беларусі, якія тут знайшлі свой апошні прытулак*».

Дабрачынцы кіраваліся наступным выказваньнем: «*Толькі тады, калі на месцах людзкіх пакутаў, будзе належным чынам ушанавана памяць па тысячах нявінных ахвярах, толькі тады з нашае зямілі будзе цалкам змыты гэты крывавы сорам*».

Хай дае Бог, каб мы як мага хутчэй дачакалі моманту, калі нават не ў далёкай Іньце, а хоць недзе на Беларусі, будзе стаяць храм па нявінна загінулым падчас сталінскіх рэпрэсыяў нашых земляках. А месца сьмерці тысячаў беларусаў-вязьняў ГУЛАГу на поўначы наведае жменька беларускіх урадаўцаў. Дасюль за пабудову помніка загінуўшым там ураджэнцам Беларусі выказаўся шэраг грамадзкіх арганізацыяў ды выбітных культурных ды палітычных дзеячаў. Сярод якіх Адам Мальдзіс, беларускі гісторык Беласточчыны Алег Латышонак, Маладзёвае аб'яднаньне «Гісторыка» й іншыя.

А пакуль што даводзіцца мясцоваму творчаму камяку-рупліўцу зь Інты ды сыну колішняга «*нязгоднага з палітыкай камунізму*» беларуса, якому нават пасьля сьмерці Сталіна было пажыцьцёва забаронена вяртацца на радзіму, назаўсёды нябачыцца са сваякамі й роднымі, дбаць праз кіраўніка тутэйшае адміністарцыі, ў зусім чужога нейкім там беларусам чалавека сп. Сьпірыдонава, пра клопат і адвечны годны супачын тысячаў нашых суайчыньнікаў сярод паўночных сьнягоў. ■

ПРАБЛЕМА

# Белавежская пушча нішчыцца

ГАЛІНА ЖЫБУЛЬ

**Белавежская пушча — адзін з самых старых, рэліктавых лясоў не толькі ў Еўропе, але, бадай, і ва ўсім свеце.**

Першыя звесткі пра яе можна знайсці яшчэ ў Іпацьеўскім летапісе. А ўвогуле, як лічаць вучоныя, узрост пушчы каля 13 тысяч гадоў, і ў дагістарычныя часы па яе тэрыторыі разгульвалі мускусны бык, паўночны алень, пячорны мядзведзь і мамант. Тут больш за тысячу дрэў-веліканаў, 400–600-гадовыя дубы, 250–350-гадовыя ясені і сосны, 200–250-гадовыя елі.

У 1992 годзе рашэннем *UNESCO* Дзяржаўны нацыянальны парк «Белавежская пушча» быў уключаны ў Спіс Сусветнай спадчыны чалавецтва, а ў 1993 годзе яму прысвоены статус біясфернага запаведніка. І, нарэшце, у 1997 годзе гэты унікальны прыродны аб'ект, адзін з самых тытулаваных запаведнікаў свету, узнагароджваецца Дыпломам Савета Еўропы за поспехі ў справе аховы прыроды, пасля чаго трапляе пад апеку гэтай арганізацыі.

Лічыцца, што ад разграбленне ў савецкія часы пушчу выратавалі генеральныя сакратары партыі. Хаця, як кажуць дасведчаныя людзі, увесь Саўмін, які даволі працяглы час курыраваў пушчу, змог пабудаваць сабе дачы з пушчанскага лесу. Егеры расказваюць, што ў савецкія часы паляванні ў пушчы праходзілі па-браканьерску. Паляванні часоў Хрушчова запомніліся мясцовым жыхарам вялікай колькасцю гарэлкі і сытнымі абедамі. Мікіта Сяргеевіч, як прыгадваюць пушчанцы, паляваў загонным метадам, а вось Пётр Машэраў быў аматарам пастраляць з-пад фараў аўтамабіля, якія паралізавалі звера.

Але сапраўдныя непрыемнасці для пушчы пачаліся пасля прыходу да ўлады Лукашэнкі і перадачы яе ў падпарадкаванне Упраўленню справамі прэзідэнта, якое да нядаўняй пары ўзначальваў Іван Ціцянкоў. Прыехаўшы першы раз у пушчу, Іван Іванавіч ледзь не звар'яцеў ад таго, колькі лесу «*дарэмна прападае*». Ён піў у славутых Віскулях гарэлку з пушчанскім начальствам, бесперапынна мацярыўся і ўвесь час паўтараў: «*Пiліце, пiліце i не шкадуйце – нам вельмі патрэбны грошы*».

Каб ажыццявіць план хуткага папаўнення дзяржаўнай казны, сюды прыслалі новага дырэктара – Васіля Жукава, былога старшыню калгаса. Перад чалавекам, абсалютна некампетэнтным у справе аховы прыроды, лясной гаспадарцы, была пастаўлена задача арыентавацца выключна на рубкі, разгарнуць на пушчанскіх землях шырокую гаспадарчую дзейнасць. Тут былі пабудаваны дарогі, зроблена электрыфікацыя і тэлефанізацыя кардонаў, створана конеферма, разводзілі гусей, дзікіх качак... Але жаданага прыбытку гэта не прыносіла, і тады набылі ў Германіі пад прэзідэнцкі крэдыт у 2 мільёны долараў новую пілараму. Але яна пілавала толькі сырую драўніну, а не сухастой.

Васіля Жукава, які не справіўся з лесанарыхтоўкамі, памянялі на яго намесніка, потом даверылі пакіраваць старому пушчанцу, патомнаму лесаводу Яўгену Смактуновічу, а цяпер прызначылі старшыню Камітэта рыбааховы, раней генеральнага дырэктара Прыпяцкага нацыянальнага парка Мікалая Бамбізу, які ў свой час пабудаваў там «*маленькі заводзік*», што перапрацоўваў каля 1000 кубаметраў драўніны ў тыдзень. Гавораць, што яго працай засталіся вельмі задаволеныя наверсе, цэняць як добрага гаспадарніка, які ўмее зарабляць грошы. Затое ў Прыпяцкім нацпарку яшчэ не забыліся на тое, колькі векавых пойменных дубоў, ялінаў і ясеняў пайшло на паркет і на іншую прамысловую дошку.

Набыты вопыт Мікалай Бамбіза ўжо выкарыстоўвае і ў Белавежскай пушчы. Усю вырубку – а гэта каля 100 тысяч кубаметраў сухой драўніны ў год – гоняць у дошку і брус, з іх у сталярным цэху вырабляюць дзверы, аконныя блокі, іншыя прадметы шырокага спажывання. Гэта лічыцца больш прыбытковай справай, чым прадаваць ствалы белавежскага сухастоя. Сухастоем тут, між іншым, з'яўляюцца ў асноўным стогадовыя унікальныя елкі і сосны. (Як вядома, у 1998 годзе была аб'яўлена забарона на вываз з пушчы дрэў ва ўзросце больш за 100 гадоў.) Драўніна з іх надзвычай моцная, чырванаватага адцення. Спецыялісты лічаць злачынствам яе выкарыстанне для такой прадукцыі. Так што цяпер пушча мала чым адрозніваецца ад звычайнага леспрамгаса.

З-за паніжэння ўзроўню грунтовых водаў (а гэта адбылося дзякуючы меліярацыйным работам, праведзеным вакол пушчы, і парушэнню гідралагічнага рэжыму тэрыторыі) лес пачынае сохнуць. Больш за іншыя дрэвы пацярпела елка, бо яе кораневая сістэма ідзе неглыбока, аслабелі і іншыя пароды, у атаку пайшлі караеды.

Праца на новай лесапільні ажыццяўляецца ўжо два гады лічы што падпольна, бо гэты агрэгат не прыняты спецыяльнай камісіяй. Пры пілаванні сухой драўніны ідзе шмат пылу, а пылаўлоўлівальнікі не прадугледжаныя на гэтай раме, і таму ствараецца пажаранебяспечная абстаноўка і парушаюцца правілы гігіены і санітарыі. Гэтыя абставіны прымусілі, відаць, кіраўніцтва пушчы ўвесці на лесапільні начную змену. Людзі не сыходзяць – ім патрэбен заробак, хаця ведаюць, што працаваць у такіх умовах небяспечна для жыцця: пару гадоў падыхаў смоламі – маеш рак лёгкіх.

Пасля закупкі ў Германіі гэтай злашчаснай пiларамы фінансавае становішча Нацыянальнага парка «Белавежская пушча», якое і раней было незайздросным, стала проста катастрафічным. Скончыліся адтэрміноўкі па плацяжах за крэдыт. Да 1 ліпеня 2001 года плацілі толькі працэнты па крэдыце – па эквіваленце каля 100 тысяч нямецкіх марак. Цяпер жа трэба выплочваць поўны крэдыт. А грошай няма. Выратаваць магла толькі драўніна, многа драўніны. Вось і дадумаўся генеральны дырэктар Бамбіза пад выглядам барацьбы з караедам арганізаваць суцэльную высечку «жывога» лесу на вялікіх плошчах. Праўдамі-няпраўдамі дзеля ажыццяўлення такой акцыі быў атрыманы і спецыяльны дазвол. Між іншым, дадзены ён быў з парушэннем існуючага парадку, без правядзення вучонага савета. Вось гэты дакумент.




Але ажыццявіць акцыю не ўдалося дзякуючы намаганням грамадскасці. Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя аператыўна стварыла яшчэ адну камісію для праверкі фактаў і прыняцця рашэння па рубках. Узначаліў яе акадэмік Віктар Парфёнаў, які вельмі добра ведае пушчу, працаваў у ёй і з'яўляецца членам вучонага савета парка. Гэтай камісіяй былі выяўлены шматлікія грубейшыя парушэнні правілаў тэхналагічнай дысцыпліны рубак, а таксама заканадаўства пры іх ажыццяўленні. У дакуменце, падпісаным членамі камісіі, адзначаецца, што, акрамя рубкі лесу, іншыя метады барацьбы са шкоднікамі-караедамі тут не прымяняліся і не прымяняюцца. Такім чынам, камісіяй зроблены вывад, што для дырэкцыі нацыянальнага парка «Белавежская пушча» галоўнае – не перамагчы караеда, а зрубіць пабольш дрэў.

Пакуль што суцэльныя вырубкі жывога леса ў пушчы ўдалося спыніць. Але ці надоўга? ■

Міністэрства лясной гаспадаркі
Рэспублікі Беларусь
17.07.01 № 08-3-4

**Нацыянальны парк «Белавежская пушча»**

Мінлесгас па ўзгадненню з Мінпрыроды дазваляе правядзенне суцэльных рубак расстроеных насаджэнняў елкі на тэрыторыі Нацыянальнага парка «Белавежская пушча» ў кварталах 507, 529, 585, 586, 653, 621 Хвойніцкага, Каралева-Мастоўскага і Нікорскага лясніцтваў агульнай плошчай 15,52 га з захаваннем іншых парод дрэў і рэалізацыі мерапрыемстваў, якія садзейнічаюць натуральнаму аднаўленню.

**Першы намеснік Міністра
Н. Т. Юшкевіч**

МУЗЫКА

# Рокеры выбіраюць

МІКОЛА РЭЧЫЦКІ

**Падобна на тое, што напярэдадні выбараў *open-air* рок-фэсты трывала вяртаюцца ў кантэкст сталічнай рок-культуры. Чарговае мерапрыемства пад назвай «Выбірай... і адрывайся!» прайшло 9 жніўня на адкрытай пляцоўцы парка Чалюскінцаў.**

Гэтым разам «выбіраеўскі» сэйшн адбыўся пад шыльдай прэзэнтацыі сумеснай кампіляцыі БМА і «Бульбы рэкардс» пад назвай «Беларускі Турба-Міксэр». Праўда, прадстаўнік «Бульбы» Раман Арлоў так і не пасьпеў нарэзаць тыраж абяцанага рэлізу да патрэбнага моманту. Але прэс-сакратар БМА*group* (і па сумяшчальніцтву кампаніі «Выбірай!») Сяргей Сахараў не вельмі сумаваў з гэтай нагоды. Нягледзячы на дождж, у парку сабралося пад паўтары тысячы чалавек, зь якіх, па ацэнках арганізатараў, палова прайшла за свае грошы, й яшчэ палова – на халяву.

Увогуле, атмасфэра была сьвяточнай і вельмі нагадвала ельцынскія сэйшны «Галасуй альбо прайграеш». Асабліва моцныя асацыяцыі ўзьнікалі гледзячы на дзяўчынак ды хлопчыкаў, абклееных з ног да галавы мабілізацыйнымі й зуброўскімі налепкамі. Гэта пры тым, што ажыцьцяўляючая ахову Беларуская партыя свабоды жорстка шманала ўсіх на ўваходзе, адбіраючы палітычныя ўлёткі й налепкі – каб не падставіць арганізатараў. Шмон адбываўся даволі карэктна, але няўхільна, і можна меркаваць, што БПСаўцы разжыліся на вялікую гару макулатуры. У праносе зуброўскіх налепак быў западозраны нават ваш карэспандэнт. Канешне, палітычную кантрабанду журналісты на канцэрт цягаць не зьбіраліся, а вось піва з другога-трэцяга заходу пранесьці было ў прынцыпе рэальна – прэсу даглядалі больш паблажліва.

Што тычыцць уласна музычнай часткі, то збольшага канцэрт атрымаўся. Праўда, кантынгент удзельнікаў дастаткова ўмоўна карэляваў з пазначаным у сьпісе «Турба-Міксэра». Але, у прынцыпе, зьяўленьне на сцэне праекта Зьміцера Вайцюшкевіча, а асабліва гурта



*SPLENETIC*, толькі ўзмацніла праграму. (Першы, дарэчы, выступаў з музычна-палітычнай сатырай на вершы Дранько-Майсюка, што максымальна актуалізавала сэйшн у кантэксьце мабілізацыйнай кампаніі). Шкада пры гэтым, што не атрымалася пачуць на пляцоўцы беларускіх хіпхопераў з праекту «ХЛОП-Ч». Як паказвае досьвед чэрвеньскай «Фашысцкай гадзіны», спалучэньне хіпхопу з рокам і хардкорам часам можа выглядаць вельмі й вельмі цікава. Зь іншага боку, больш папсовая БМАшная тусоўка магла б і не ацаніць эфэкту ў поўнай меры.

З рознай ступеньню аддачы, але збольшага пасьпяхова, адвыступаліся «КУКЛЫ», «ЛОНГ ПЛЭЙ», Валік Грышко. Прабіў публіку энэргічны выступ каманды *SPLENETIC*. Праект – адна з надзеяў айчыннага хардкору. Калі б «Рок-каранацыя» не адкінула канькі, то каманда магла б сур'ёзна разьлічваць на «Адкрыцьцё году». Асабліва моцна праект глядзіцца пасьля ўзмацненьня складу за кошт бубнача з «СОНЦА МАО». Энэргетыка, драйв, адвязнае шоу – усе вонкавыя спэцэфэкты *SPLENETIC* адпрацоўвае на «5+». Пры гэтым яшчэ адзін плюс – спэцыфіка вакалу даваляе лічыць беларускамоўнымі любыя тэксты (як казаў Астап Бэндэр, «*Хто скажа, што гэта ня так, – хай першы кіне ў мяне камень*»). Прынамсі, харызматычны вакаліст Дэйв клянецца ў вернасьці роднай мове. Драйвовы выступ *SPLENETIC* дабілі на біс хітом «Куля ў тваёй галаве, спажывец!». Гэтым разам без Алеся Таболіча на бэк-вакале, песьня слухалася больш сьціпла, але разагрэты натоўп схаваў і такі варыянт.

Потым на сцэну выйшлі легендарныя палацаўцы, а за імі скандальны «ІМПЭТТ». «Імпэтаўцы», нягледзячы на маладосьць, ужо праславіліся сваёй вайной з музычнай прэсай, галоўным прызом «БАСовішча-01» і музычным падабенствам з заходнімі *GUANO APES*. Праўда, іхны мэнэджэр прыходзіць у лютасьць, калі пры ім узгадваюць апошні факт. Гурт зьяўляецца адным з апошніх пратэжэ БМА і таму Сяргей Сахараў у адказ на ўсе нараканьні на адрас новых зорак вые воўкам: «*Пакіньце іх у спакоі, дайце хоць адну рок-зорку сапраўдную стварыць!*». Упартае шматгадовае імкненьне БМА да штампоўкі рок-зорак па канонах эстраднага шоу-бізнэсу аддае трывіяльнай прафанацыяй. Але гэта тэма для асобнай, працяглай і беспаспяховай дыскусіі...

І вось нарэшце цямнее, і на сцэну выходзяць тыя, каго чакала ўся публіка, – Лявон Вольскі й кампанія. Спачатку алдовыя беларускія рокеры выступаюць з песьнямі супольнага праекту «Я НАРАДЗІЎСЯ ТУТ», а потым распачынаецца бенефіс мастадонтаў з *N.R.M.* Што тут можна сказаць? Добрага – мала.

Аўтар гэтых радкоў даволі даўно не назіраў у нармалёвым фармаце жывога выступу *N.R.M.*, таму цікава было паглядзець, да чаго дараслі айчынныя рокеры нумар адзін. На жаль, нічога добрага сказаць не магу. Безумоўна, майстэрства шоу, скокаў па сцэне ўдасканальваецца з кожным годам – па драйвовасьці й выверанасьці падачы рок-каралям няма роўных у Беларусі. Але, хай не крыўдуе Лявон, сапраўдны рок-музыка мусіць яшчэ нешта даваць сваім слухачам, апроч кайфу й магчымасьці пабалдзець. Атмасфэра песень, што ідуць у натоўп, не зьмяняецца апошнія тры гады. Пачуцьце незадаволенасьці навакольным жыцьцём, лірычная прага свабоды й сьцёб з навакольнага маразму даўно пераплаўленыя ў адно экстатычнае пачуцьцё, якое выплёскваецца ва ўсіх песьнях на адной ноце й амаль без варыяцыяў – прадукт, безумоўна, вельмі зручны для спажываньня, але на дзіва аднастайны й прадказальны. Зьмяняюцца толькі назвы хітоў і распарадак скокаў па сцэне. Шчыра кажучы, нават *ZET* слухаецца больш цікава, разнастайна й шчыра.

Яшчэ адзін нядобры асадак – дэманстратыўнае чаканьне выкліку на біс пасьля трох кампазыцыяў. Не думалася, што дзіцячая гульня ў Сьнягурку можа выклікаць такое захапленьне ў здаровых дзецюкоў і дзяўчын, што на поўныя грудзі скандуюць «*N.R.M.! N.R.M.!*», патрабуючы назад куміраў. Куміры вяртаюцца, выконваючы хітова-папсовых «Чарапах», безь якіх, відавочна, праграма была б ня скончаная. Далей – натоўпы экзальтаваных дзяўчынак штурмуюць мікрааўтобус, паўгадзінная раздача аўтографаў...

А ўвогуле, сэйшн атрымаўся. Задаволеныя ўсе – і арганізатары, і фанаты, і музыканты. Наперадзе – чарговыя «выбіраеўскія» канцэрты ў рэгіёнах. І як паказвае расейскі досьвед 1996 года, плён ад такіх акцыяў ёсьць.

■

СПОРТ

## Рекорды не главное...

Наиболее значимым спортивным событием последнего времени стал чемпионат мира по легкой атлетике в канадском Эдмонтоне. Практически все сильнейшие легкоатлеты мира приняли в нем участие, и это обещало интересную, захватывающую борьбу. Организаторы чемпионата (и их можно понять) уверяли всех в том, что будут обновлены многие рекорды. В этом смысле мировой форум ожиданий не оправдал – не было установлено ни одного нового мирового достижения. Зато остального хватало.

В любом виде спорта есть свои признанные лидеры. Даже не лидеры, а некие символы, олицетворяющие собой Победу. Никто не сомневается, что они будут первыми, ведь это совершенно естественно. Остается только наблюдать их триумф и в очередной раз восхищаться тем, как красиво это было сделано. Безусловно, одной из таких знаковых фигур является Мэрион Джонс. Если учесть, что забег на сто метров считается наиболее престижной дисциплиной, то американку смело можно назвать королевой легкой атлетики. Посудите сами: начиная с чемпионата мира 1997 года в Афинах, она не знала поражений, выиграв за это время сорок семь забегов. Она настолько приучила всех к своим победам, что никто даже не допускал иного исхода. Именно такая мысль сквозила во всех ее предчемпионатных интервью и репортажах журналистов. Однако спорт хорош именно тем, что наверняка что-либо предсказать невозможно, даже в столь очевидных случаях. И уже начало чемпионата принесло сенсацию. Королева стометровки была свергнута с трона, а на ее место взошла новая: отныне самая быстрая женщина мира украинская спортсменка Жанна Пинтусевич. Состояние присутствующих на стадионе и у экранов телевизоров описать сложно, а взгляд Мэрион Джонс выражал лишь одно – непонимание произошедшего. Реабилитироваться американка сумела лишь на двухсотметровке, в которой Жанна Пинтусевич участвовать отказалась. Понять ее можно: как закончиться забег неизвестно, а так она осталась непобежденной.

В схожей ситуации оказалась еще одна, казалось бы, незыблемая фигура. Эфиопский стайер Хайле Гебреселассие связывал с этим чемпионатом особые надежды. Победитель четырех последних чемпионатов мира, человек, не проигравший ни одного старта с 1993 года, в случае выигрыша в Эдмонтоне мог бы стать в один ряд с Сергеем Бубкой, завоевав пятый титул чемпиона мира. И он был близок к этому, ему не хватило какой-то малости. Лидируя практически весь забег, он упустил победу уже на последних сотнях метров. В итоге – только бронза. То, что не удалось Гебреселассие, с блеском сумел осуществить немецкий дискобол Ларс Ридль. Триумфатор мировых первенств в Токио, Штутгарте, Гетеборге и Афинах подошел к этому чемпионату не в лучшей своей форме, и многим могло показаться, что на этот раз победить он не сможет. Однако настоящий чемпион на то и чемпион, что бы показать свою силу именно тогда, когда это наиболее необходимо. Ридль выложился в финале полностью, и теперь в мире два пятикратных чемпиона мира – он и Сергей Бубка.

Удачно выступила и белорусская сборная, завоевавшая четыре медали: одну золотую и три серебряных. В целом, примерно такой результат и ожидался. Накануне чемпионата у белорусских болельщиков была уверенность, что как минимум три медали у нас будут. Вопрос в том, какого достоинства. Наши спортсмены ожидания оправдали, лишь одно настораживает: все наши медали добыты представительницами слабого пола. Где мужчины?

Неплохим для наших спортсменок стало начало и завершение чемпионата. Сперва свой высокий уровень подтвердила Янина Корольчик, не знавшая себе равных в секторе для толкания ядра. Затем первую из трех серебряных медалей нашей команде принесла семиборка Наталья Сазанович. Следующей медали пришлось ждать довольно долго и была она во многом неожиданна. Белорусские любители спорта уже успели отвыкнуть от успехов наших спортсменов в спортивной ходьбе, каковая когда-то постоянно поставляла медали в командную копилку. Эту добрую традицию в Эдмонтоне возродила пришедшая второй Валентина Цыбульская. Еще одну медаль нашей команде принесла метательница диска Эллина Зверева.

Как и на всех последних крупнейших соревнованиях, в Эдмонтоне не обошлось без допингового скандала. Наибольшую известность получила ситуация вокруг россиянки Ольги Егоровой. В силу того, что проба на допинг, взятая у нее накануне первенства мира, была проведена с нарушениями, ей разрешили участвовать в забеге на 5000 метров. Это вызвало весьма болезненную реакцию ее основной конкурентки Габриэлы Сабо, которая пригрозила байкотировать эту дистанцию. В итоге румынка все же вышла на дистанцию, но оказалась не готова к развернувшейся борьбе, и к финишу пришла лишь восьмой. Егорова же завоевала золотую медаль. Попала в скандальную ситуацию и белорусская спортсменка Наталья Сологуб. В ее пробах был обнаружен норандростерон, что, естественно, повлекло за собой дисквалификацию. Нашей команде в эстафете 4х400 метров пришлось срочно искать замену, а сама спортсменка как минимум два года нигде не сможет выступать.

В целом, чемпионат мира прошел в интересной борьбе, разрушив многие прогнозы. Его можно назвать даже более демократичным. Ведь если раньше число победителей определялось весьма ограниченным кругом стран, то в этом году золото чемпионата мира сумели добыть представители двадцати трех государств. Из общей массы выделялись (и то не в таких масштабах, как ранее) лишь США и Россия, завоевавшие по девятнадцать наград, остальные выступали более-менее ровно. Та же команда Беларуси со своими четырьмя медалями лишь на три награды отстала от занявшей третье место сборной Кении.

**Подготовил Сергей Витальев**

КІНО

# Як браты-славяне ўладу бралі

ТАЦЦЯНА ПАЛЯКОВА

**У Мінску ў рамках кампаніі «Выбірай» прайшлі паўпадпольныя паказы дакум ентальных фільмах кінафесту «*Jeden svet – one word*». Амаль усе стужкі прысвечаны гвалтоўным падзеям у постсацыялістычных краінах.**

Сутыкненне асобы і рэжыму. Сутыкненне народнай гістарычнай культуры з дэгенератыўнай масавай субкультурай. Народная прага свабоды, што змятае ненавісны рэжым Мілошавіча. Гвалтоўнае знішчэнне мусульман у Босніі. Рэпартажы расейца Андрэя Бабіцкага з Чачэнскай вайны. «Аксамітная рэвалюцыя» ў Чэхаславакіі. Права на небяспечнае жыццё пад бокам у Ігналінскай АЭС. Уласна беларускія рэаліі ў вядомых фільмах Хашчавацкага і Міндліна «Звычайны прэзідэнт» і «Страх»...

Жадаючых прыняць удзел у праглядзе на адной з мінскіх вуліц чакаў хлопец з праграмай фестывалю ў руцэ. Ён і адводзіў групу жадаючых (каля дзесяці чалавек) у належнае месца. Антураж падзеі цалкам адпавядаў абставінам падпольнай барацьбы з дыктатарскім рэжымам.

Фільм сербскага рэжысёра Аляксандра Маніча «Багр» міжволі выклікае асацыяцыі з Беларуссю. Героі стужкі «Багр», што ў перакладзе з сербскага «бульдозер», – жыхары вескі ў ста кіламетрах ад Бялграду. Як бацькі і дзяды, яны цяжка працуюць на зямлі, а вечарамі глядзяць тэлевізар. Краіна выбірае Каштуніцу, але Мілошавіч з экрана аб'яўляе ўласную перамогу. Асабліва раздражняе аднаго з герояў нахабная тэлежурналістка, якая штодзень плешча з экранаў мярзоты і хлусню.

Настае момант, калі жыхары вёскі разумеюць, што больш не ў стане трываць панаванне Мілошавіча, яны вырашаюць ехаць у Бялград, каб скінуць ненавісны рэжым.

«*Мы, сербы, – вялікі і руплівы народ*, – кажа адзін з вяскоўцаў, – *але гэты рэжым рабіў нам ганьбу. Мана нам усім надакучыла. Мы гатовы былі зубамі рваць паліцыянтаў*».

Свет ведае мноства тыпажоў апазіцыянераў. Ёсць экстрэмісты. Ёсць амаль штатныя змагары з рэжымам. Некаторым з іх за дзесяцігоддзі палымянай барацьбы ў офісах на фоне факсаў трэба было б ужо пенсію выплочваць, калі абстрагавацца ад вынікаў.

Героі сербскай стужкі дэманструюць іншую, рэлігійную парадыгму змагання:

– 24 кастрычніка я пакляўся, – кажа вясковец, – калі дажыву да заўтра, мы крочым у Бялград. Бо мусім разабрацца з Мілошавічам па-мужчынску, зрабіць Каштуніцу прэзідэнтам, таму што так хацеў народ сербскі. Таму я вырашыў, хай будзе, як дасць Бог, толькі не хацелася б мне памерці да таго, як убачу ягоны канец.

Дваццаць тысяч сапраўдных сербскіх мужчын, завёўшы трактары, бульдозеры і ўласныя аўтамабілі, рушылі ў сталіцу. Яны везлі з сабой камяні, стрэльбы і тапары. Яны змялі на дарозе ўсе кардоны паліцыянтаў. Голымі рукамі перакульвалі грузавікі. Адзін з іх кажа:

– Мы ляцелі як тайфун. Здаецца, ніхто з нас не ўжываў наркотыкі, але ж мы адчувалі сябе як быццам абкураныя. Увесь час мы сябе падбухторвалі, бо ведалі – назад дарогі няма, мы павінны ісці наперад.

У сталіцы калону чакалі амаль сто тысяч жыхароў, віталі, частавалі. Калона паехала да парламенту, дзе ўжо не першы дзень працягваўся мітынг. Мы бачым, як бульдозер, які вядзе адін з герояў, уязжае ўнутр будынка, як за ім рушыць натоўп. У наступных кадрах той жа бульдозер штурмуе будынак тэлевізіі. Раз'юшаныя людзі збіваюць генеральнага дырэктара. Ён валяецца на падлозе, закрывае галаву. Потым нехта, самы памяркоўны, падымае яго і ўводзіць, каб не дайшло да забойства.

Адзін з вяскоўцаў расказвае, як доўгі час ён не мог без пагарды слухаць хлусню тэлевядучай. Нарэшце ён сустрэўся з ёю твар у твар.

– Я як даў ёй аплявуху! – расказвае вясковец, далёка адводзячы руку назад, чым відавочна дае зразумець, аплявуха сапраўды была вельмі добрай. – І праз гэта на мяне сышла палёгка. Больш я біць нікога не хацеў.

Наступныя кадры дэманструюць напалоханага Мілошавіча, які публічна прызнае перамогу Каштуніцы. І голас дыктара: 5 кастрычніка назаўсёды ўвойдзе ў гісторыю сербскага народа.

Але гэта яшчэ не канец стужкі. Напрыканцы нам паказваюць дужага мужчыну. Ён кажа:

– Тыя, што пайшлі, ужо не вернуцца. А тыя, што прыйшлі, мы таксама за вамі назіраем. Калі будзеце рабіць не тое, што трэба, будзе з вамі тое ж самае, што з Мілошавічам.

Як памятаем, пэўны перыяд пасля югаслаўскіх падзей наша прэса займалася разважаннямі: дзе беларускі Каштуніца? Пагледзеўшы фільм Аляксандра Маніча хочацца адказаць: там жа, дзе і беларускі народ!

■

АНОНС

**Клуб «ТОННЕЛЬ»**

30 августа. **Концерт группы** «DEADУШКИ»(С.-Пб.) **с участием белорусских проектов** «Валик Гришко и друзья», «А-ЛЕКС», *STEREO NOISE GALLERY, FAT NOT DEAD*. **Начало в 19-00.**

1 сентября. **Выступление группы** *TEQUILAJAZZZ* **при участии минских команд** «ІМПЭТТ», «ЦМОКІ». **Начало в 19-00.**

**ВСЕБЕЛОРУССКИЙ ТУР ГРУППЫ «НЕЙРО ДЮБЕЛЬ»**

График концертов: 18.08 – Барановичи, 19.08 – Пинск, 20.08 – Солигорск, 21.08 – Слуцк, 22.08 – Бобруйск, 23.08 – Светлогорск, 25.08 – Кричев, 26.08 – Орша, 27.08 – Новополоцк, 28.08 – Борисов, 29.08 – Витебск, 30.08 – Минск (парк Челюскинцев), 31.08 – Могилев, 01.09 – Гомель, 02.09 – Брест, 03.09 – Гродно, 15.09 – Минск (ДК «Сукно»). В концертах принимает участие группа **«ТТ- 34»**.



## ПОНЕДЕЛЬНИК, 20 АВГУСТА

**7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 23.50** Новости.
**7.10** Доброе утро, Беларусь!
**8.00** Резонанс.
**9.15** «Морская полиция». Сериал.
**10.10** Телебарометр. Прогноз погоды.
**10.30** Здоровье. Тележурнал.
**11.15** «Человек моря». Сериал.
**12.05** «Иди туда - не знаю куда». Мультфильм.
**13.10** Худ. фильм «Юркины рассветы». 1-я серия.
**14.20** Док.сериал «Сокровища мировой культуры».
**14.35** Уроки Н.Новожиловой.
**15.10** Фильм - детям. «По секрету всему свету». Худ. фильм. 1-я и 2-я серии.
**17.10** «Морская полиция». Сериал.
**18.25** Зона Икс.
**18.40** «Тайные пружины политики». Авторская программа Юрия Азаренка.
**19.05** Комедия «Красавчик Джо».
**20.40** Колыбельная.
**21.00** Панорама. Информационный канал.
**21.45** Права человека: взгляд в мир.
**22.10** «Человек моря». Сериал.
**22.55** Стадион.
**23.20** Планета «АРТ».

**16.00** Сериал «Собачье дело».
**17.00, 22.30** Новости.
**17.20** Веселые истории в журнале «Ералаш».
**17.30** «С легким паром!» В гостях у Михаила Евдокимова.
**18.00** «Земля любви». Сериал.
**19.00** Жди меня.
**20.00** Время.
**20.40** «Закон джунглей». Документальный сериал.
**21.35** Сериал «Секретные материалы».
**22.55** «На футболе» с Виктором Гусевым.
**23.35** Комедийный сериал «Полная безопасность».

РТР

**7.15** «Экспертиза РТР».
**7.30** «Москва - Минск».
**7.45** «Православный календарь».
**7.50** Семейные новости.
**8.15** «Два рояля». Музыкально-развлекательная программа.
**9.00** Моя семья.
**10.00** Вести.
**10.30** Сатирический киножурнал «Фитиль».
**10.45** «Санта-Барбара». Сериал.
**16.00** Вести.
**16.30** Станислав Любшин, Олег Янковский и Алла Демидова в детективе «Щит и меч». 1-я серия. 1968г.
**18.00** Приключенческий сериал «Амазонка».
**19.00** Вести.
**19.30** Местное время. Вести - Москва.
**19.50** Вечерний сеанс. Александр Белявский, Витаутас Томкус и Валентина Титова в детективе «Ралли». 1978г.
**21.40** Сатирический киножурнал «Фитиль».
**22.00** Вести.
**22.30** Местное время. Вести - Москва.
**22.40** «Спорт за неделю».
**23.40** Последний сеанс. Премия «Оскар». Уильям Холден и Алек Гиннесс в фильме Дэвида Лина «Мост через реку Квай». 1957г.
**2.25** Прогноз погоды.

**7.05, 11.30, 13.30, 17.30, 19.30, 23.00** Новости культуры.
**7.20** После новостей...
**7.40** «Раз, два - горе не беда!» Худ. фильм. Режиссер М.Юзовский.
**9.10** «Дело житейское».
**9.35** Зарубежное документальное кино. «Доменико Скарлатти». 1-я серия.
**10.40** «Блистательные Азераки». Сериал. Режиссер Лорен Карсель.
**11.40** «Подкидыш». Худ. фильм. Режиссер Т.Лукашевич.
**12.55** «Corvus Cornix - с латинского «ворона». Док. фильм. Режиссер Ж.Романова.
**13.45** «Ох, уж эти детки!» Мультсериал.
**14.15** Русские цари. Авторская программа А.Панченко. «Грозный царь - Иван Васильевич». Фильм 1-й.
**15.00** Новости.
**15.10** Кино-детям. «Энн из поместья «Зеленые крыши». Телесериал.
**15.40** Л.Бетховен. Соната ь9 для скрипки и фортепиано.
**16.10** Архитектурная галерея. «Интерьеры».
**16.25** «Власть факта».
**16.40** «Блистательные Азераки». Сериал. Режиссер Лорен Карсель.
**17.40** «Из концертного зала». М.Мусоргский - М.Равель «Картинки с выставки».
**18.15** Острова. Геннадий Айги.
**19.10** «Вечерняя сказка».
**19.15** «Комаров». Мультфильм.
**19.50** «И огонь, и пламя». Сериал. Режиссер П.Сиссар.
**20.45** После новостей...
**21.05** Н.В.Гоголь. «Игроки». Спектакль Новосибирского молодежного театра «Глобус». Режиссер А.Галибин.
**22.40** «Санжыра». Короткометражный художественный фильм. Режиссер Нургент Эген.
**23.20** Программа передач.

НТВ

**5.00, 6.00, 7.00** «Сегодня утром». Информационная программа.
**5.15, 6.15, 7.15** Спорт, погода.
**5.20, 6.25** Криминал.
**5.30, 6.35** Впрок.
**5.40, 6.45, 7.20** Карданный вал.
**5.45** Мультфильм.
**7.30** Дог-шоу «Я и моя собака».
**8.25** Служба спасения.
**9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00** Сегодня.
**9.25** Комедия «Русский бизнес».
**11.30** Сериал. А.Мирнов, А.Папанов, Р.Быков, О.Табаков, С.Крамаров и Л.Полищук в комедии М.Захарова «Двенадцать стульев».
**13.30** Старый телевизор.
**14.30** Программа на бис. «Куклы».
**15.35** Криминал.
**15.50** Сериал «Ее звали Никита».
**16.50** Сериал «Кружева».
**18.35** Криминал.
**19.00** Наше кино. Н.Караченцов, Ю.Яковлев, И.Шмелева, В.Смехов, И.Смоктуновский и Е.Коренева в детективе «Ловушка для одинокого мужчины».
**21.50** Премьера НТВ. С.Варчук, Б.Шувалов, Л.Дуров, М.Сахарова и А.Жарков в детективе «Поворот ключа».
**23.00** Криминал.
**23.15** Сериал. Боевик «Солдаты удачи».
**0.15** Программа передач на завтра.

TV6 МОСКВА

**5.45** Дорожный патруль. Сводка за неделю.
**6.00** День за днем.
**8.00** Новости с Алексеем Воробьевым.
**8.25** Сериал «Агент национальной безопасности-II»: «Снежный человек».
**9.30** Все в сад!
**10.00** Ток-шоу «В нашу гавань заходили корабли».
**11.00** Сериал «Следствие ведут знатоки». Дело ь11. «Любой ценой».
**13.00** «Телемагазин в Минске».
**13.10** «Вы очевидец» с И.Усачевым.
**14.00** «Сегодня» с Вячеславом Крискевичем.
**14.30** Сериал «Я - супермодель»: «Клаудиа Шиффер».
**15.40** «Телемагазин в Минске».
**16.20** Юмористический сериал «Третья планета от Солнца».
**16.55** Сериал «Воспоминания Шерлока Холмса»: «Золотое пенсне».
**18.00** «Сегодня» с Вячеславом Крискевичем.
**18.40** Сериал «Шпионские игры».
**19.45** Дорожный патруль.
**20.00** «Сегодня» с Марианной Максимовской.
**20.35** Тушите свет.
**20.45** Сериал «Полковник Грушко против мафии».
**22.00** «Сегодня» с Владимиром Кара-Мурзой.
**22.40** Дорожный патруль.
**22.55** Кинотеатр ТВ-6. «Прачечная».
**0.05** Дорожный патруль.

**8.00** «Версты». Путешествие в Россию.
**8.40** Смотрите на канале.
**8.45** Телемагазин.
**9.05** Лусия Мендес в телесериале «ТРИ ЖИЗНИ СОФИИ».
**10.00** СОБЫТИЯ. Время московское.
**10.15** Телеканал «Дата».
**11.10** Петровка, 38.
**11.20** Удачный выбор.
**11.35** «Момент истины». Авторская программа А.Караулова.
**12.30** Деловая Москва.
**13.00** СОБЫТИЯ. Время московское.
**13.15** «ИНСПЕКТОР КРЕСС». Детективный сериал.
**14.30** Худ. фильм «МОЯ МАЛЕНЬКАЯ МАМА».
**15.00** Регионы: прямая речь.
**15.30** Прогулки с Алексеем Баталовым.
**16.00** СОБЫТИЯ. Время московское.
**16.15** ТЕЛЕСТАДИОН. «На пятачке». Хоккейное обозрение.
**16.45** «ВПК без грифа «Секретно».
**17.15** Все о здоровье в программе «21 кабинет».
**17.40** «Хвосты». Мультфильм.
**18.05** «УЗУРПАТОРША». Сериал.
**18.50** Пять минут с деловой Москвой.
**19.00** СОБЫТИЯ. Время московское.
**19.45** «Особая папка».
**20.10** Прогноз погоды.
**20.15** Комедия «МАНИЯ ВЕЛИЧИЯ».
**22.15** Времечко.
**22.45** Петровка, 38.
**23.00** 25-Й ЧАС. СОБЫТИЯ. Время московское.
**23.20** Ночной полет.
**23.55** «КОРОЛЕВСТВО». Ларса фон Триера. Сериал. 1-я серия.

**6.30** «Кот по имени Ик». Мультсериал.
**7.00** «Питер Пен». Мультсериал.
**7.30** «Король Артур и рыцари без страха и упрека». Мультсериал.
**8.00** Новости.
**8.15** Телеспецназ.
**8.30** Мир спорта глазами «Жиллетт».
**9.00** Комедия «КРЕСТНЫЙ ОТЕЦ ИЗ ГОНКОНГА».
**11.15** Метро.
**11.30** Случайный свидетель.
**12.00** Новости.
**12.45** REN TV - 10 лет.
**13.50** «УБОЙНАЯ СИЛА». Сериал.
**15.00** «Ползучее войско». Мультсериал.
**15.30** «Кот по имени Ик». Мультсериал.
**16.00** «Питер Пен». Мультсериал.
**16.30** «Король Артур и рыцари без страха и упрека». Мультсериал.
**17.00** «ЧЕРТЕНОК». Теленовелла.
**19.00** «Симпсоны». Мультсериал.
**19.30** Боевик «ЖЕНЩИНА-ТЕРМИНАТОР».
**21.35** «УБОЙНАЯ СИЛА». Сериал.
**23.00** «Обозрение». Информационный канал.
**23.45** Футбольный курьер.

**5.30** «Счастливого пути!» Музыкальная программа.
**5.45, 14.25** «ОСТРОВ-БАБОЧКА». Сериал. 27-я серия.
**6.30** «Чудесные уроки». «Домашний логопед».
**6.40** Мультсериал «Черный пират». 9-я серия.
**7.10, 23.30** «ЛЮДИ И ГОРЫ». Сериал.
**7.35** «ВЕТЕР В СПИНУ». Сериал. 40-я серия.
**8.30** «Из жизни животных...» Ведущая Н.Истратова.
**8.45** Кинематограф XX. Худ. фильм «ЗВЕЗДЫ ЭГЕРА». 1-я серия. Венгрия.
**10.00** «Представляет Большой...» Гала-концерт «Звезды оперы и балета Большого».
**10.25** Научно-популярный сериал «Путеводитель для гурманов». «Путешествие в страну пряностей. Где растет перец?».
**10.50** Если у вас ЧП...
**11.00** Мультсериал «Черный пират». 9-я серия.
**11.20** «Счастливого пути!» Музыкальная программа.
**11.45** АСТ-журнал.
**12.10** «Чудесные уроки». «Домашний логопед».
**12.35, 0.00** «СТРАСТИ». Сериал. 5-я серия.
**13.30** Док. фильм «Простой русский солдат». К 10-й годовщине августовских событий в Москве.
**14.50** Программа мультфильмов: «Гунан Батор», «Золушка».
**15.30** Худ. фильм «ВОЗВРАЩЕНИЕ БУДУЛАЯ». 1-я серия. ТО «Экран».
**16.50** Если у вас ЧП...
**17.00** Алло, Россия!
**17.30** Мужские заботы.
**18.00** Научно-популярный сериал «Путеводитель для гурманов». «Путешествие в страну пряностей. Где растет перец?».
**18.30, 3.10** «ЗЕЛЕНАЯ БРИГАДА». Сериал. 4-я серия.
**19.30** Док. фильм «Простой русский солдат». К 10-й годовщине августовских событий в Москве.
**20.30** «Из жизни животных...» Ведущая Н.Истратова.
**20.45** Кинематограф XX. Худ. фильм «ЗВЕЗДЫ ЭГЕРА». 1-я серия. Венгрия.
**22.00** «Мир без политики». По материалам международных информационных агентств.
**22.30, 2.15** «ЧЕЛОВЕК И МОРЕ». Сериал.
**22.55** «Представляет Большой...» Гала-концерт «Звезды оперы и балета Большого».
**1.00** Мальчишник.
**1.25** «НЕУКРОТИМАЯ ХИЛЬДА». Сериал. 15-я серия.
**2.45** АСТ-журнал.
**4.05** «Представляет Большой...» Гала-концерт «Звезды оперы и балета Большого».
**4.30** Мужские заботы.

## ВТОРНИК, 21 АВГУСТА

**7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 23.55** Новости.
**7.10** Доброе утро, Беларусь!
**8.05** «Морская полиция». Сериал.
**9.10** «Маленькие Эйнштейны». Сериал для детей.
**9.35** Стадион.
**10.00** Док.сериал «Природные чудеса Америки». 1-я и 2-я серии.
**11.15** «Человек моря». Сериал.
**12.05** «Тропа, тропиночка, дорога». Док. фильм. К 140-летию со дня рождения актера и режиссера И.Буйницкого.
**12.30** Арсенал. Программа об армии.
**13.10** «Юркины рассветы». Худ. фильм. 2-я серия.
**14.10** Док.сериал «Сокровища мировой культуры».
**15.15** «Маленькие изобретения». Мультсериал.
**15.20** «Мой любимый зверь». Док.сериал для детей.
**15.30** «Все на орбиту!» Познавательный сериал для детей.
**15.40** «Маленькие Эйнштейны». Сериал для детей.
**16.10** «Приключения швейцарской семьи Робинсонов». Сериал.
**17.05** «Морская полиция». Сериал.
**18.20** Зона Икс.
**18.30** «Выборы-2001».
**19.35** Док. фильм.
**20.40** Колыбельная.
**21.00** Панорама. Информационный канал.
**21.50** «Москва - Минск».
**22.15** «Человек моря». Сериал.
**23.00** Спорт-курьер.
**23.10** Ток-шоу «Будни». «Инвалиды: пока живет надежда».

**8.15** «Земля любви». Сериал.
**10.10** Смехопанорама Евгения Петросяна.
**10.45** Вкусные истории.
**10.50** Библиомания.
**15.00** «Большая стирка».
**16.00** Сериал «Собачье дело».
**17.20** Дикие звезды Голливуда.
**17.50** «Земля любви». Сериал.
**18.55** «Зимняя вишня». 3-я серия.
**20.00** Время.
**20.40** Летняя комедия. «Больше, чем жизнь».
**22.55** Э.Радзинский. «Моя театральная жизнь». Фильм 1-й.
**23.45** Мелодрама «Подруги навсегда».

РТР

